# МЭТЫ АМБІЦЫЙНЫЯ, АЛЕ РЭАЛЬНЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пяць гадоў таму кіраўнік дзяржавы ўжо наведваў прадпрыемства, якое тады перажывала не лепшыя часы. Абстаноўка была амаль цалкам зношана, адпаведна, падалі аб'ёмы вытворчасці прадукцыі і пагаршалася фінансавая сітуацыя. Мае калегі-журналісты, якія тады, у снежні 2012-га, наведвалі разам з Прэзідэнтам «Камволь», успаміналі, як было холадна ў цэхах — літаральна як на вуліцы! Цяпер жанчыны, што працуюць на фабрыцы, усе прызвычаіліся пераабувацца на рабоце ў лёгкія туфлікі. Як бачым, ужо па ўзроўні камфортнасці працы становічыя змены — відавочныя. І гэта далёка не самае вялікае дасягненне «Камволя» за апошнія гады.

Галоўнае — удалося захаваць сваю школу вытворчасці тканін, а таксама — працоўныя месцы.

— Я лічу гэта злачынствам: калі дзяржава ўмее нешта вырабляць, а пасля гэта пахавае — гэта дрэнны знак, — сказаў Прэзідэнт.

## У пачатку шляху

Аляксандр Лукашэнка сказаў шчыра, што ў яго пакуль няма канчатковага разумення, задаволены ён зробленым ці не. На «Камволь» кіраўнік краіны хацеў прыехаць ужо даўно, але адкладваў візіт, бо даклады па развіцці прадпрыемства аптымізму не ўсялялі, ды і мадэрнізацыя тады яшчэ не была завершана.

— Вось праз год можна будзе сказаць: прадпрыемства, якое ўстаялася, якое вырабляе добрыя тканіны, яны прадаюцца на сусветных рынках — і вы атрымліваеце нармальную зарплату. Мы яшчэ ў пачатку шляху, — заўважыў Прэзідэнт.

Ёсць становічыя фактары: на прадпрыемства могуць уладкавацца людзі — а пытанне працаўладкавання сёння для краіны адно з самых актуальных. Тым больш, як агучыў кіраўнік краіны, тыя паўтары сотні працоўных месцаў, якія яшчэ не занятыя, прызначаны ў асноўным для жанчын, якім знайсці работу складаней.

## Вырабіць — і прадаць

Падчас наведвання прадпрыемства кіраўнік краіны паглядзеў розныя цэхі і паназіраў, як выпрабляецца тканіна — пачынаючы ад апрацоўкі сыравіны, выпрадання з яе нітак і заканчваючы гатовымі ўзорамі, з якіх можна нешта пашыць. Размаўляючы з чыноўнікамі, інвестарамі — з «Камволем» узо супрацоўнічае турэцкая кампанія Zen Led — Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на аб'ёмы вытворчасці. Шэсць мільёнаў пагонных метраў у год (праектная магутнасць прадпрыемства пасля мадэрнізацыі) — далёка не мяжа. Кіраўнік дзяржавы даручыў не проста дасягнуць гэтага паказчыка, а вывесці вытворчасць на 7—8 мільёнаў пагонных метраў тканіны ў год.

— Сёння я з'язджаю з думкай, што гэта трэба рабіць, пакуль мяне ніхто не разупэўніў, — сказаў кіраўнік краіны, звяртаючыся да калектыву прадпрыемства. — Я спытаў у нашых турэцкіх сяброў: вы зможаце прадаць 12 мільёнаў і за які час? Бо вырабіць — мы вырабім, але ж трэба прадаць. Яны мне сказалі, што на працягу трох-чатырох гадоў мы можам, ствараючы брэнд, выйсці на продаж 12 мільёнаў. Ну, можа, памыліліся, няхай 10. Але гэта 10! А калісьці мы выраблялі 20. Так, гэта была не тая тканіна, зусім не тая вытворчасць. Але на рынку добрая тканіна патрэбна.

## Унутраны попыт ёсць

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што ў якаснай тканіне, якую ўжо сёння вырабляе «Камволь», зацікаўлена і ўся краіна. Дарэчы, учора некаторыя кіраўнікі былі апранутыя ў касцюмы, пашытыя з тканіны гэтага прадпрыемства. А Прэзідэнт прызнаўся, што сам хоча пашыць сабе з яе гарнітур.

Падчас сустрэчы з працоўным калектывам прадпрыемства кіраўнік краіны адказаў на пытанні, якія цікавілі камвольчаў.

Юлія Казак, аператар вузлавязальнага абсталявання, звярнула ўвагу, што штогод у краіне праходзіць шмат спартыўных, культурных мерапрыемстваў. Яна пацікавілася, ці можна ў асноўным для пашыву касцюмаў для ўдзельнікаў выкарыстоўваць тканіну «Камволя».

— Навошта ж тады будавалі гэта прадпрыемства? — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт. — Мы ў краіне перапрацоўваем недзе 1,2 мільёна пагонных метраў тканіны. Ну а ў цэлым недзе паўтара. Сёння я даручыў міністру, каб у наступным годзе паўтара мільёна на ўнутраным рынку — гэта ж наш рынак — узяць адсюль і пашыць з іх гатовыя вырабы. Гэта значыць, мы будзем вас падтрымліваць. Але майце на ўвазе: закрыцца ад продажу тут тканін кітайскіх, расійскіх, турэцкіх мы не можам як мінімум з дзвюх прычын. Першая — канкурэнцыя: ёсць канкурэнцыя, ёсць якасць, ёсць рост. Па-другое, калі мы закрыемся ад некага, хутка закрыюцца і ад нас.

Кацярына Баранава, бухгалтар, звярнула ўвагу, што ў краіне шмат прыватных прадпрыемстваў, што займаюцца пашывам адзення. Ці можна зрабіць так, каб яны маглі — для вытворчасці, не для перапродажу — ільготна набываць тканіны «Камволя»? Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што гэта цалкам магчыма.

— Сёння швейнай вытворчасцю займацца выгадна, — звярнуў увагу ён. — Швачак не хапае ў краіне. Гэта было складана ўявіць у савецкія часы. Але пакуль іх не хапае, і гэта няхватка вельмі сур'ёзна заработную плату ў іх падняла, швачка сёння атрымлівае прыстойныя грошы. Таму мы будзем падтрымліваць і падтрымліваем швейную вытворчасць, але, яшчэ раз падкрэсліваю, усё гэта не бязмежна. Мы і так уклалі 100 з лішнім мільёнаў долараў у вашу вытворчасць і, проста па-чалавечы вам кажу, не чакайце дадатковых льгот.

## Забарона праблему не рашае

Майстар Надзея Аляксеева прысвяціла сваё пытанне праблеме алкагалізму: што можна тут зрабіць на дзяржаўным узроўні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што аднымі забаронамі праблему не вырашыш. Наадварот, гэта, як паказвае практыка, прыводзіць да актывізацыі продажу нядобраякаснай алкагольнай прадукцыі. На думку Аляксандра Лукашэнкі, трэба больш увагі ўдзяляць здароваму, актыўнаму ладу жыцця на ўсіх узроўнях — ад сям'і да дзяржавы. Што да іншых мер, то тут неабходна ісці ад жыцця.

Памочнік майстра Віктар Філіпаў з ткацкага цэха пацікавіўся меркаваннем кіраўніка краіны наконт таго, што расійскія спартсмены не змогуць выступаць на зімовай Алімпіядзе 2018 года пад сваім сцягам. Як Прэзідэнт ставіцца да гэтых санкцый Міжнароднага алімпійскага камітэта? Дарэчы, сам Віктар Філіпаў займаецца спортам — парашутным.

— Прэзідэнт Расіі правільную, я лічу, зрабіў заяву, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Кожны спартсмен, калі ён хоча, павінен паехаць пад любым флагам на Алімпіяду. Калі б гэта, не дай Бог, здарылася з беларусамі, я б зрабіў гэтак жа. Ты можаш, гэта тваё жыццё — едзь і паказвай вынік. Гэту праблему Расія можа вырашыць прыгожа, даказаўшы ўсяму свету, што яна вялікая спартыўная дзяржава і што ў дачыненні да яе паступілі несправядліва — калі спартсмены-расіяне туды паедуць.

Што да допінгу, то, прызнаўся кіраўнік нашай краіны, ён цалкам падтрымлівае барацьбу Міжнароднага алімпійскага камітэта.

* * *

Прадпрыемства «Камволь» заснавана ў 1955 годзе, і зараз асартымент выпускаемай там прадукцыі даволі шырокі. У той жа час, нягледзячы на станоўчую дынаміку аб'ёмаў, фінансавае становішча «Камволя» застаецца няпростым: на складах заляжалася занадта шмат прадукцыі, і гэта пры тым, што аб'ёмы вытворчасці растуць.

Традыцыйным рынкам збыту для тканін, што выпрабляюцца на прадпрыемстве, застаецца Расія — туды накіроўваецца 80% усёй прадукцыі. Ёсць продажы таксама ва Узбекістан, Літву, Польшчу, Азербайджан, Малдову, Украіну.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Брусель абвясціў аб прарыве ў перамовах з Вялікабрытаніяй па Brexit

Вялікабрытанія і Еўрапейскі саюз дасягнулі прарыву ў перамовах па выхадзе каралеўства са складу ЕС (Brexit). Пра гэта паведаміў кіраўнік Еўракамісіі (ЕК) Жан-Клод Юнкер, перадае Reuters. Адпаведную заяву ён зрабіў неўзабаве пасля заканчэння перамоў з прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі Тэрэзай Мэй. Па словах Юнкера, дасягнутых дамоўленасцяў дастаткова для завяршэння першага этапу перамоваў па Brexit. На фоне заявы кіраўніка ЕК яго памочнік Марцін Селмаер апублікаваў у сваім мікраблогу ў Twitter фатаграфію трубы, з якой валіць белы дым. На думку некаторых СМІ, гэтая выява — алюзія на дым, які з'яўляецца над Сікстынскай капэлай пры выбарах Папы Рымскага.



### Суддзя запатрабаваў арыштаваць экс-прэзідэнта Аргенціны Крысціну Кіршнер за «здраду Радзіме»

Федэральны суддзя Аргенціны Клаўдыё Банадзіа накіраваў запыт на зняцце пад хатні арышт былога прэзідэнта краіны Крысціны Фернандэс дэ Кіршнер, высунуўшы супраць яе абвінавачванне ў «здрадзе Радзіме». Суддзя мяркуе, што, застаючыся на волі, Кіршнер можа перашкодзіць расследаванню, паведамляе La Nation. Кіршнер падазраецца ва ўтойванні ролі Ірана ў тэракце 1994 года ў Буэнас-Айрэсе. Суддзя звярнуўся да верхняй палаты парламента Аргенціны, каб Кіршнер, якая напрыканцы кастрычніка ўвайшла ў склад сената, пазбавілі парламенцкага імунітэту.

### З'езд СДПГ пераабраў Шульца і даў «зялёнае святло» кааліцыйным перамовам

Рашэнне аб пачатку кааліцыйных перамоваў на чале з Марцінам Шульцам прынята з фармулёўкай, што весціся яны будуць «з адкрытым вынікам», гэта значыць без абавязковай прывязкі да станоўчага выніку. Такім чынам, сацыял-дэмакраты даюць зразумець, што не збіраюцца аўтаматычна згаджацца на ўсе ўмовы кансерватараў і не пойдуць на стварэнне кааліцыі з Меркель, калі партыя не зможа рэалізаваць сваю праграму. «Справа ў змесце, а не ў форме. Мы не павінны ісці ва ўрад любой цаной», — сказаў Шульц. У ХДС ужо адрэагавалі на гатоўнасць сацыял-дэмакратаў пачаць перамовы. «Мы вітаем рашэнне, вынесенае на з'ездзе СДПГ. Наша мэта — сфарміраваць надзейны і стабільны ўрад», — напісаў у Twitter выканаўчы дырэктар ХДС Клаўс Шулер.

### Урад Японіі назваў апошні дзень праўлення імператара Акіхіта

Як паведамляе тэлеканал NHK, імператар, як было вызначана раней, будзе выконваць свае абавязкі да 30 красавіка 2019 года, а 1 мая на трон узыдзе яго спадчыннік. Рашэнне пра дату першага за апошнія 200 гадоў адрачэння імператара Японіі было прынята на спецыяльным пасяджэнні з удзелам прэм'ер-міністра Сіндза Абэ, генеральнага сакратара Кабміна Ёсіхідэ Сугі, старшыняў абедзвюх палат парламента, кіраўніка Вярхоўнага суда краіны і прадстаўнікоў імператарскага двара. Цяпер урад разглядае магчымасць аб'явіць дзень уступлення новага імператара на трон святочным — гэта рашэнне можа падарыць японцам 10 выхадных запар.



## Парламенцкі дзённік

# І СУЧАСНАЯ СТАМАТАЛОГІЯ

**Кіраўнік Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА ў Докшыцкім раёне правёў прыём грамадзян і ўзяў удзел у адкрыцці стаматалагічнай паліклінікі.**

На асабістай сустрэчы жыхары раёна агучылі камунальныя праблемы: наконт газіфікацыі, неабходнасці рамонту балконаў. Была выказана і падзяка райвыканкаму за дзіцячую пляцоўку ў двары дома. Яшчэ заяўнікі прасілі дапамогу ў лячэнні, і ім абяцана магчымасць аперацыі ў Мінску.

Каментуючы вынікі сустрэчы з грамадзянамі, спікер ніжняй палаты беларускага парламента, падкрэсліў, што народныя выбраннікі на пастаянай сувязі з людзьмі. Кожны месяц на працягу тыдня парламентарыі выязджаюць у свае акругі, дзе працуюць са зваротамі грамадзян, праводзяць прыёмы. Як паказвае практыка, многія праблемы можна вырашыць на ўзроўні мясцовай улады.

Добрым падарункам для жыхароў раёна стала адкрыццё ў Докшыцах стаматалагічнай паліклінікі. Сучасны медыцынскі комплекс узводзілі прыблізна два гады. Выдаткавалі больш за 2,1 мільёна рублёў, прыкладна чвэрць з гэтай сумы накіравалі на пакупку абсталявання. У ліку іншага адчынілі і рэканструяванае пратэзнае аддзяленне. Цяпер жыхары глыбінкі могуць атрымаць медыцынскую дапамогу, не горш чым у сталіцы. Дарэчы, у гэтай медыцынскай установе гатовыя абслугоўваць і пацыентаў з суседняга Крупскага раёна Міншчыны. Адпаведная арганізацыйная работа ўжо вядзецца. Галівудская ўсмешка стане цалкам рэальнай для вяскоўцаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

# ЧАЛАВЕК ДАЕ ЗГОДУ

## Як абараніць правы пацыента

**Сёння, калі медыцынскія тэхналогіі так імкліва развіваюцца, пацыент павінен атрымліваць максімальную інфармацыю аб тых умяшаннях, якія яму будуць праводзіцца. Абмеркаванне формы прадастаўлення важных для пацыента звестак адбылося падчас наладжанай пры ўдзеле Савета Еўропы канферэнцыі «Добраахвотная інфармаваная згода як важны прынцып абароны правоў чалавека ў галіне біямедыцыны».**

Як паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы Міністэрства аховы здароўя Беларусі, старшыня Нацыянальнага камітэта па біяэтыцы Алена БОГДАН**, добраахвотная інфармаваная згода на аказанне меддапамогі мае асаблівае значэнне ў галіне, скажам, трансплантацыі органаў і тканак, дзіцячай хірургіі, анкалогіі. І тут важна абараніць правы і чалавека-пацыента, і чалавека-урача. Сваё слова павінны сказаць судовыя органы, пракуратура.

Паводле закона, згода пацыента на аказанне меддапамогі можа быць атрымана як у вуснай форме — на простае ўмяшанне (той жа агляд урачом акушэрам-гінеколагам), так і ў пісьмовай форме, калі размова ідзе пра складанае, аператыўнае ўмяшанне. Пацыент павінен быць інфармаваны ўрачом аб тым, што яму будзе праводзіцца, і якія могуць узнікнуць пасля гэтага ўскладненні, бо застрахавацца ад іх на сто працэнтаў немагчыма.

— Транспланталогія ўраўнаважвае, з аднаго боку, гібель чалавека, а з другога — шанц на працяг жыцця, — кажа **кіраўнік РНПЦ трансплантацыі органаў і тканак Алег РУМО**. — Мы павінны зрабіць так, каб боль ад страты блізкага не быў перамешаны з нейкімі дадатковымі адмоўнымі эмоцыямі, звязанымі з тым, што нехта не вылечыў майго сваяка да канца, і цяпер яго органы будуць выкарыстаны для ўратавання іншых. Адбудаваць сістэму перасадак органаў і тканак вельмі лёгка, калі грамадства давярае сістэме аховы здароўя. У краінах, дзе гэтыя пытанні не ўрэгуляваныя, дзе грамадства не прымае прэзумпцыю згоды на падобныя ўмяшанні, транспланталогія не атрымлівае развіцця.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## Тэхналогіі

# КРАІНА НОВЫХ БІЗНЕСАЎ

## У Мінску пройдзе конкурс «Стартап года»

**Мерапрыемства запланавана на 16 снежня. Прагназуецца, што падзея збярэ больш за 500 удзельнікаў з краін Еўропы, Азіі і Амерыкі.**

Новаўвядзенне гэтага года ў тым, што ўсе стартапы і інвестпраекты будуць падзеленыя па тэматычных секцыях, так званых трэках. Напрыклад, падарожжы, фінтэх ці здароўе і медыцынская тэхніка. У кожнай з іх выберуць пераможцаў, якія і выйдуць у фінал.

— Сапраўды эфектыўнымі аказваецца далёка не так шмат стартапаў, тым не менш спроба іх запуску — гэта велізарны вопыт. Большасць з тых, хто гэта паспрабаваў, але не давёў да канца з першага разу, праз некаторы час зноў імкнуцца зайсці на рынак ужо з новай ідэяй. Да таго ж часцей за ўсё гэта не патрабуе велізарных укладанняў. Адзін з самых паспяховых праектаў, які пачалі рэалізоўваць на нашай пляцоўцы, — сэрвіс Maps.me, яго за вельмі буйную суму выкупіла кампанія Mail.Ru. Актыўна развіваецца Eightydays.me, прызначаны для зручнай арганізацыі паездак з наведваннем некалькіх гарадоў, а таксама Trinity3.me — інавацыйная сістэма даверанага кіравання, — адзначыў **дырэктар цэнтра прадпрымальніцтва «Стартап-тэхналогіі» Аляксей ШАБЛОЎСКІ.**

Па словах спецыяліста, у Беларусі ёсць усе шанцы стаць краінай стартапаў, на дадзены момант гэтую нішу па праве займаюць Ізраіль і ЗША: «У нас творчы і прасунуты народ, ёсць добрая база для ўкаранення ІТ-тэхналогій, а таксама развіты прамысловы сектар — на іх стыку магчыма стварэнне цікавых прадуктаў».

Што датычыцца непасрэдна конкурсу, то ён пройдзе пры падтрымцы Мінгарвыканкама, Міністэрства эканомікі і Парка высокіх тэхналогій.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*